# НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ СУДОВА-СЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў АДНОСІНАХ ДА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ АНТЫЎРАДАВАГА РУХУ 1863 ГОДА (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ВІЦЕБСКАЙ І МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНЯЎ)

***Глазырын С.Я.***
*канд. гіст. навук, дац., Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай*

**Светлай памяці майго любага бацкі**

З другой паловы 50-х гг. XIX ст. у Расійскай імперыі распачаўся глыбокі сацыяльна-эканамічны крызіс. На пачатку 1860-х гг. ён ускладніўся грамадска-палітычным крызісам, які ў першую чаргу, выявіўся ў межах т.зв. "западных окраин" імперыі – Царстве Польскім і заходніх губерняў. Мясцовае насельніцтва выказала жаданне атрымаць больш шырокую палітычную і культурную аўтанмію альбо наогул адбудаваць незалежную Рэч Паспалітую ў межах 1772 года. Эскалацыя напруджанасці адбылася пасля жорсткага разгону ўрадавым войскам мірнай дэманстрацыі ў Варшаве 15.02. 1861 г. (тут і далей даты ст.ст.), у выніку якогоа загінула 5 чалавек. З гэтага часу антыўрадавы рух пашырыўся на тэрыторыю паўночна-заходніх губерняў імперыі (Віленская, Ковенская, Гарадзенская, Мінская, Віцебская і Магілёўская). У межах руху адбываліся патрыятычныя маніфестацыі, жалобныя набажэнствы ў рымска-каталіцкіх касцёлах, акты непадпарадкавання ўладам.

Урад Расійскай імперыі вымушаны быў рэагаваць на пашырэнне антыўрадавых настрояў, перш за ўсё, выданнем адпаведных нарматыўна-прававых актаў. Адной з мэт выдання новых нарматыўна-прававых актаў было рэгуляванне судова-следчай дзейнасці ў адносінах да асоб-удзельнікаў антыўрадавага руху, з аднаго боку, і змяншэнне нагрузкі на дзеййсную судовую сістэму, з другога, якую выкліка імклівы рост т.зв. "палітычных" правапарушэнняў і злачынстваў.

Адным з першых мерапрыемстваў дзяржавы ў межах барацьбы супраць антыўрадавага руху на тэрыторыі паўночна-заходніх губерняў было стварэнне часовых **паліцэйскіх судоў**. Іх дзейнасць рэгулявалася "Высочайше утверждённым Положением Совета Министров «Об учреждении полицейских судов в Западных губерниях»" ад 05.08. 1861 года. Між іншага, "Положение…" выпрацавала тэрмін **праступка супрасць усталяванай сітэмы кіраўніцтва і супраць грамадскага спакою** ў якасці асобнага віда правапарушэння. Да супрацьпраўных дзеянняў, якія кваліфікаваліся як праступак, згодна дакумента адносіліся: публічнае спяванне забароненых гімнаў і песень, публічнае выкарыстанне забароненых ўмоўных значкоў і сімвалаў, публічныя грашовыя зборы на карысць асоб, якія панеслі адміністрацыйнае спагнанне і г.д. Пазначаныя праступкі ад гэтага часу станавіліся аб'ектам новаўтворанай судова-паліцэйскай юрысдыкцыі. Раней падобныя справы вырашаліся адміністрацыйным парадкам г.зн. прдстаўнікамі мясцовай выканаўчай улады (генерал-губернатары, губернатары і г.д.). З іншага боку, "Положение…" супрацьпастаўляе **палітычны адміністрацыйны праступак палітычнаму злачынству,** як дзеянню, якое мае больш небяспечныя наступствы для грамадскай і дзяржаўнай бяспепкі. Палітычнае злачынства патрапляла пад юрысдыкцыю крымінальнага суда. Адпаведна ступені грамадскай небяспекі палітычнага праступка, прававым актам вызначаліся адпаведныя віды пакаранняў і спагнанняў: **а) грашовы штраф** у памеры ад 10 да 800 рублёў + **б) арышт тэрмінам** ад 3 дзён да 2 месяцаў. У выпадку няздольнасці вінаватага сплаціць грашовы штраф, прадугледжвалася **– в) турэмнае зняволенне** тэрмінам ад 1 месяца да 1 года. Адметна, што дакумент не вызначаў **узрост адміністрацыйнай адказнасці** за палітычныя праступкі. Прадугледжвалася толькі скарачэнне тэрміну арышта для асоб прызнаных вінаватымі ва ўзросце да 17 гадоў. Жанчыны, прызнаныя вінаватымі вызваляліся ад арышту.

Паліцэйскі суд утварараўся ў якасці суда першай інстанцыі на тэрыторыі губернскага горада ў межах павятовага суда, які тут знаходзіўся. Нарматыўна-прававы акт вызначаў наступны склад паліцэскага суда: павятовы суддзя, адзін з засядацеляў павятовага суда і член-камісар, прызначаны ўрадам. Судом другой інстанцыі з'яўляўся **апеляцыйны паліцэйскій суд,** які склікаўся ў Вільні альбо Кіеве ў складзе аднаго са старшыняў судовых палат, аднаго з таварышаў старшыні судовых палат і аднаго з саветнікаў губернскага праўлення па прызначэнні генерал-губернатара. Судовыя выракі апеляцыйнага паліцэйскана суда з'яўляліся канчатковымі і абскарджанню не падлягалі. Агульны надзор за судамі абедзвух інстанцый, згодна "Положения…" ажыццяўляў віленскі альбо кіеўскі губернскі пракурор. Судаводства па палітычных праступках вызначалася паскораным характарам: пісьмовы вырак суда першай інстанцыі выносіўся цягам трох дзён + сямідзённы тэрін апеляцыі, пісьмовы вырак апеляцыйнага паліцэскага суда таксама выносіўся цягам трох дзён. Для больш хуткага разгляду спраў па палітычных праступкаў, нарматыўна-прававым актам прадугледжвалася працэдура **завочнага судаводства[ ].**

**Часовыя паліцэйскія суды** ў Віцебску і Магілёве былі ўтвораны да 12.09. 1861 года. Гэты перыяд адзначаны ўздымам антыўрадавага руху (апрананне забароненых "рэвалюцыйных", "жалобных" строяў, выкарыстоўванне "рэвалюцыйных" значкоў, спяванне забароненых гімнаў) на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Аднак да пачатку кастрычніка 1861 года **паліцэйскія суды** тут не распачалі ніводнай палітычнай справы, што бачна са зместу афіцыйнай перапіскі. У прыватнасці, магілёўскі губернатар А.П. Беклімешаў 21.09. 1861 года паведамляў: "…В настоящее же время, по предписанию управляющего Министерством внутренних дел, 12 сентября открыт в городе Могилёве полицейский суд, но случаев призыва к сему до сего числа не было". Хутка выявілася асноўная прычына, чаму ва ўмовах росту грамадска-палітычнай напруджанасці, дзейнасць паліцэйскіх судоў не актывізавалася. Мясцовая губернская адміністрацыя лічыла працэс судаводства паліцэйскіх судоў марудным (як бачна з архіўных спраў, нават незразумелым, недасканалым), таму пазбягала перадачы ў іх разгляд спраў. Некаторыя даследчыкі з іншага боку тлумачаць такія паводзіны губернскіх чыноўнікаў сімпатыяй да ўдзельнікаў антыўрадавага руху. Прыкладам, са зместу справаздачы на адрас шэфа жандараў В.А. Далагарукага вынікае, што: "Начальник губернии (маецца на ўвазе віцебскі губернатар) Оголин вместо придания виновных полицескому суду оставил их без взыскания, потому что не надеялся найти свидетелей к их их изобличению и ограничился внушениями…хотя должен был распорядится административным порядком…". Відавочна, такія паводзіны губернатара з'яўляюцца фактам перавышэння службовых паўнамоцтваў.

Магілёўскі губернатар А.П. Беклімешаў напрыканцы 1861 года дзейнічаў падобным чынам, пра што адзначыў у сваёй справаздачы: "…я считал возможным ограничиваться на это время лишь строгим наблюдением за действиями главных виновников демонстраций и моральным влиянием к тому, чтобы манифестации не имели успеха.". У наступным 1862 годзе інтэнсіўнасць антыўрадавага руху на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў узрасла. Аднак практыка разгляду палітычных спраў паліцэйскімі судамі тут амаль не выкарыстоўвалася. Пра гэта сведчыць адсутнасць адпаведнай статыстыкі, якая маецца па іншых заходніх губернях. Амаль у кожным выпадку ў дачыненні да ўдзельнікаў антыўрадавага руху губернатары рспараджаюцца "административным порядком". Папулярнымі мерамі адміністрацыйнага пакарання з'яўляліся: **грашовы штраф, паліцэйскі нагляд, высылка на іншае месца жыхарства.** Прыкладам, з мэтай прадухілення палітычных хваляванняў на тэрыторыі Магілёўскай губерні у лютым 1863 года яе кіраўнік загадаў, між іншым, выслаць на жыхарства ва ўнутраныя губерні імперыі 6 дваран і 3 абшарнікаў, падазраваных у палітычнай "неблагонадёжности". Далей у тэксце справаздачы

можна адзначыць цікавы факт, як губернатар тлумачыць свій загад і мэту пакарання: "***Считаю, что на них нельзя смотреть как на лица обвинённые в каких-либо преступных действиях, но как на агитаторов***…, которые могут подговорить…к участию…других лиц…***Их высылка последовала лишь с целью предотвратить их гибель***..". З іншага боку, губернатары ў некаторых выпадках не былі здольныя самастойна кваліфікаваць той ці іншы супрацьпраўны ўчынак альбо *як* **палітычны адміністрацыйны праступак**, альбо як **палітычнае злачынства.** Тым больш, што "Положение..» не ўтрымлівала пералік складаў правапарушэнняў. У прыватнасці віцебскі губернатар А.С. Агалін 02.06. 1862 года звяртаўся да міністра ўнутраных спраў П.А.Валуева з просьбай растлумачыць "…следует ли предать дворянина Франковского суду и какому именно т.е. по общим ли законам или по правилам, изданным для временных полицейских судов…". Пазначаны дваранін Франкоўскі быў падазраваны ў апрананні забароненага строя і хаванні забароненай літаратуры. Так ці інакш, практыка дзейнасці паліцэйскіх судоў на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў у адносінах спраў асоб-удзельнікаў антыўрадавага руху амаль не сустракалася, яны вырашаліся адміністрацыйным парадкам.

Ужо на пачатку 1862 года стала відавочным, што дзейнасць **часовых паліцэйскіх судоў** у справе спынення антыўрадавага руху ў паўночна-заходніх губернях сталася неэфектыўнай. Афіцыйна было прызнана, што "…полицейские суды оказались малосостоятельными, не достигающими цели: они парализовали спешность действий административной власти, устраняя собою возможность употребления мер быстрых и решительных, которые могли подавлять преступление в самом начале его..». Фактычна, улады падкрэслівалі перавагу адміністрацыйных захадаў па недапушчэнні грамадскага хвалявання. Падрабязна прычыны слабой эфектыўнасці дзейнасці паліцэйскіх судоў раскрываліся віленскім генерал-губернатарм у справаздачы на імя міністра ўнутраных спраў у красавіку 1862 года. У першую чаргу яны датычыліся маруднасці працэсу справаводства: фармальнасць дзеяннў на стадыі позвы ў суд, відавочнасць супрацьпраўнага характару асобных відаў праступкаў (апрананне забароненага строю, значкоў), якія не патрабуюць дадатковых доказаў, цяжкасць пошуку і апатання сведакаў і г.д. У некаторых выпадках узровень эфектыўнасці разгляду спраў вызначаўся асабістай пазіцыяй членаў паліцэйскага суда да абвінавачаных і да антыўрадавага руху ўвогуле. Дзейнасць часовых паліцэскіх судоў была спынена пасля ўвядзення на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў вайсковага становішча.

У перыяд з 22.04 да 15.05. 1863 года на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў было ўведзена надзвычайнае вайсковае становішча ў сувязі з пачаткам тут узброеннага паўстання. Адначасова набывае моц нараматыўна-прававы акт, які рэгуляваў унтутраннае жыццё рэгіёна ў склаўшыхся ўмовах – "Положение о правилах на случай объявления каких-либо местностей Западных губерний на военном положении" ад 05.08. 1861 года. Нормы дакумента значна пашыралі паўнамоцтвы віленскага генерал-губернатара ў справе барацьбы з паўстанцкім і і антыўрадавым рухам. "Положения…" ўводзілі пасаду **часовага ваеннага губернатара** ў Віцебскай, Магілёўскай і Менскай губернях. У Віцебскай губерні функцыі **часовага ваеннага губернатара** выконваў цывільны губернатар, у Магілёўскай губерні ўводзілася пасада **часовага ваеннага начальніка і камандуючага войскам Магілёўскай губерні** з аналагічнымі паўнамоцтвамі. Між іншага, **Галоўны начальнік края** (паняцце, якое у "Положении…" аб'ядноўвала пасады віленскага-генерал-губернатара і ваеннага губернатара) атрымаў магчымасць аддаваць пад суд усе чыны земскай і гарадской паліцыі. Разам з гэтым, нарматыўны акт вызначаў норму, згодна з якой усе жыхары падлягаюць юрысдыкцыі **ваеннага (ваенна-палявога) суда,** які выносіў прысуды на падставе "Устава военно-уголовного" (складаў 5 частку "Свода военных постановлений

1859 года”). Пазначаны нарматыўна-прававы акт акрэсліваў склад вайсковага суда, рэгламентаваў працэс судаводства. Выракі вынесеныя ваеннымі судамі падлягалі канфірмацыі спачатку ваеннага губернатара, потым віленскага генерал-губернатара. На справе, канчатковае зацвярджэнне прысудаў з’ялялася выключнай кампетэнцыяй генерал-губернатара.

З мэтай удасканалення барацьбы з антыўрадавым і паўстанцкім рухам на тэрыторыі заходніх губерняў імперыі ў дадатак да “Положений…”05.08. 1861 года, імператар Аляксандр II па прапанове міністра ўнутраных спраў 14.01. 1863 года падпісаў “Высочайший рескрипт об облечении Виленского генерал-губернатора… особою властью и предоставлении ему принятия мер, необходимых к охранению спокойствия в крае, по случаю возникновения беспорядков в Царстве Польском”. Нарматыўна-прававы акт яшчэ больш пашыраў кампетэнцыю віленскага генерал-губернатара і ваенных губернатарў у справе барацьбы з паўстанцкім рухам. У прыватнасці, “Рескрипт” замацоўваў права **канчатковай канфірмацыі** прысудаў ваенных судоў па справах паўстання за генерал-губернатарам, ваненным губернатарам альбо камандуючым дывізіяй. У выпадку да асобных удзельнікаў паўстання (камандзіры атрадаў, паўстанцы захопленыя са зброяй і г.д.). канфірмаваныя выракі прыводзіліся ў выкананне тэрмінова на месцы. З мэтай больш дасканалага вызначэння ступені віны іншых падазраваных асоб, генерал-губернатар атрымаў права арганізоўваць **ваенна-судныя камісіі.** Справы асоб, якія былі прызнаныя камісіяй **больш вінаватымі** прерадаваліся на разгляд ваенных судоў, выракі выносіліся на падставе “Устава военно-уголовного” і канчаткова зацвярджаліся генерал-губернатарам. У адносінах да іншых падазраваных ў палітычных хваляваннях прадугледжваліся адміністрацыйныя спагнанні па меркаванні генерал-губернатара. Аднак у тэксце “Рескрипта” не пазначалася, на падставе якога заканадаўства, ваеннага альбо цывільнага, ён павінен дзейнічаць. Галоўнае, што вынікае са зместу нарматыўнага акта, гэта фактычна неабмежаваная судовая ўлада віленскага генерал-губернатара, забяспечаная правам **канчатковай канфірмацыі** выракаў ваенных судоў ў аднсінах да ўдзельнікаў антыўрадавага і паўстанцкага руху. Склад **ваенна-судовых камісій** вызначаўся наступным чынам: старшыня, асэсары і аудзітары, якія прызначаліся камандуючым Віленскай ваўсковай акругі, справаводцы. У Віцебскай губерні па прадпісанні віленскага генерал-губернатара на падставе “Рескрипта” у траўні 1863 года было ўтворана дзве ваенна-судовыя камісіі: Віцебская і Дынабургскаях. Камісіі дзейнічалі пры адпаведных арданакс-гаўзах на працягу 1863-1865 гг., сюды на разгляд накіроўваліся ваенна-судовыя справы са следчых камісій па палітычных справах над удзельнікамі паўстання.

Адначасова з “Рэскрыптам” 14.01. 1863 года імператар зацвердзіў “Дополнение и поянение…” да яго, які па сутнасці можна лічыць дапаможнікам для дзейнасці **ваенна-судовых і следчых камісій** у справе вызначэння ступені віны для палітычных зняволенных. У тэксце нарматыўнага акта выкладзены прынцып падзелу ўсіх датычных да паўстанцкага і антыўрадавага руху асоб на **5 катэгорый** віны сувымерна са здзейсненым злачынствам. Кожная **катэгорыя** фактычна ўяўляла сабой пералік палітычных злачынстваў (аддалена нагадвае інстытут складу палітычнага злачынства). Адпаведна ступені віны, прадугледжвалася мера пакарання. На характар пакарання таксама ўплывалі сацыяльнае паходжанне, узрост, пол. “Дополнения” прадугледжвалі наступныя віды пакаранняў у адносінах да палітычных злачынцаў: **смяротная кара, катарга, пазбаўленне правоў маёмасці і стана, высылка на жыхарства, служба ў арыштанцкай роце тэрмінам ад 1 да 5 год, служба шарагоўцам у аддаленых вайсковых частках, грашовы штраф, паліцэйскі нагляд.** Аднак на думку некаторых даследчыкаў правілы змешчаныя ў “Дополнении”

былі юрыдычна не дасканалымі, бо мелі адначасова некалькі варыянтаў прачытання. Гэта давала падставы для свавольства часовай ваеннай адміністрацыі падчас вызначэння пакарання. Нарматыўны дакумент таксама вызначаў прынцып **паскоранай завочнай формы судаводства**, які прадугледжваў недапушчэнне да працэсу чужых асоб, абаронцаў і пракурораў. Асоба, якая абвінавачвалася таксама (часцей за ўсё) не прысутнічала на паседжаннях, а знаходзілася пад **следчым арыштам.** Па выніках справаздачы **Часовага палявога аудытарыята пры камандуючым Віленскай ваеннай акгругі** (з красавіка 1863 года апошні элемент у сістэме судова-следчых органаў па справах удзельнікаў паўстання 1863 года, які разглядаў справы па палітычных злачынствах перад канчатковай канфірмацыя генерал-губернатара) на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў вынесена 10 смяротных прысудаў у дачыненні да ўдзельнікаў паўстання, за лічаных да І катэгорыі. Больш бадрабязна прасачыць сістэму вызначэння ступені віны і меры пакарання, дазваляюць дадзеныя **Часовага палявога аудытарыята** па справе аб абшарніках Полацкага павета, якія абвінавачваліся ў арганізацыі паўстання. Па справе праходзіла 40 чалавек. З іх 4 асобы аднесены да ІІ катэгорыі (актыўныя арганізатары), астатнія да IV катэгорыі (**удзел у выбарах дэлегатаў паўстанцкага камітэта, прыняцце прысягі на адданасць паўстанню, ахвяраванне грошай, падрыхтоўка да паўстання**). У адносінах да асоб ІІ катэгорыі вынесены наступныя прысуды: **пазбаўленне правоў маёмасці і стану+высылка ў Сібір)**, у адносінах да асоб IV катэгорыі: **грашовы штраф+паліцэйскі нагляд альбо толькі грашовы штраф).**

Разам з утварэннем ваенна-судовых камісій, зноў жа на падставе “Рескрипта” 14.01. 1863 года па распарадджэнні віленскага генерал-губернатара з мэтай “водворения порядка в губерниях и уездах” былі арганізаваны **следчыя камісіі па палітычных справах над удзельнікамі паўстання.** Асноўная функцыя **следчых камісій –** следства над удзельнікамі антыўрадавага і паўстанцкага руху. На тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў камісіі былі ўтвораны ў наступных гарадах: у Віцебску – 12.04.1863 года (ліквідавана 01.01. 1865 года), Дынабургу – 12.04. 1863 года (дзейнічала з 05.05. 1863 года, ліквідавана 14.01. 1865 года), Магілёве - сярэдзіна красавіка 1863 года, Чэрыкаве, Сянно, Воршы і Горках – 25.05. 1863 года. Склад слэдчых камісій вызначаўся па ўзоры камісій, якія дзейнічалі ў Царстве Польскім: старшыня, 3–4 члена па прызначэнні міністэра ўнутраных спраў і міністра юстыцыі, шэфа Корпуса жандараў, генерал-губернатара, чыноўнікі дзяржустаноў, якія былі ім падначаленыя, павятовы жандарскі штаб-афіцэр, павятовы страпчы і камандзір мясцовай ваеннай брыгады. Працэс справаводства ў следчых камісіях вызначаўся адпаведнымі распараджэннямі міністра ўнутраных спраў і віленскага генерал-губернатара: допыт праводзіўся не меньш чым 3 членамі ў прысутнасці камісіі, паседжанні праводзіліся два разы на дзень, дзеля таго, каб рашэнні былі прынятыя ў гэты ж дзень. Пасля заканчэння следства камісія складала **кароткую запіску** з кароткім зместам сутнасці справы, вытрымкамі з допытаў аб прызнанні віны падазроных асоб. Непасрэдна палітычная справа разам с запіскай перадавалася на разгляд ваеннага начальніка альбо ваеннага губернатара, якія са сваёй справаздачай аб мерах пакарання падазроных асоб (перадача ў венна-судовую камісію альбо адміністрацыйнае пакаранне) і выніковай запіскай звярталіся на разгляд міністра ўнутранных спраў і віленскага генерал-губернатара. Адміністрацыйна камісіі падпарадкоўваліся ваенным начальнікам. Згодна архіўных дадзеных, на разгляд **следчых камісій па палітычных справах** Віцебскай і Магілёўскай губерняў паступілі справы ў адносінах прыкладна 1000 асоб датычных да паўстання 1863 года. Разам з тым, архіўныя дакументы сведчаць пра значныя недахопы ў дзейнасці **следчых камісій**: з прычыны стабільнага павілічэння колькасці падазроных асоб яны не заўсёды якасна выконвалі свае функцыі. Акрамя таго, адсутнічаў

вопыт асуджэння ваеннымі судамі вялікай колькасці палітычных злачынцаў. Сярод членаў камісій выяўляліся тыя, у каго адсутнічаў досвед выканання адпаведных функцый. Акрамя ўласна следчых функцый, камісіі абцяжарваліся выкананнем шэрага адміністрацыйных працэдур (ліставанне, складанне попісаў і справаздач і г.д.), што натуральна зніжала якасць асноўнай дзейнасці. Часта справы, разгляд якіх камісіямі быў завершаны, не паспявалі перадаваць на разгляд **ваенна-судовых камісій**. Здаралася так, што асобныя следчыя справы заставаліся ў камісіях больш за год.

Цікавы бок праблемы, на наш погляд, уяўляе пытанне пра нарматыўна-прававое рэгуляванне судова-следчай дзейнасці ў адносінах да жанчын-удзельніц антыўрадавага і антыпўстанцкага руху 1861-1863 гг. Як падавалася вышэй, у адносінах да пазначаных асоб дзейнічалі нормы "Положения об учреждении полицейских судов..." 05.08. 1861 года, "Положения о правилах на случай объявления…" 05.08.1861 года. У першым выпадку вырак выносіўся **паліцэйскім судом** (на практыцы губернатарам, ваенным губернатарам) на падставе "Уложения о наказаниях уголовных и исправительных" (уваходзіў у склад 15 часткі "Свода законов Российской империи" 1857 года), аднак "Положение" прадугледжвала змягчэнне меры пакарання ў адносінах да жанчын (яны пазбягалі **арышту**). У другім выпадку, вырак выносіўся **ваенным судом** на падставе "Устава военно-уголовного" (складаў 5 частку "Свода военных постановлений 1859 года") і канчаткова зацвярджаўся віленскім генерал-губернатарам. У сувязі з павелічэннем колькасці жанчын-удзельніц антыўрадавага і паўстанцкага руху з пачаткам узброеннага паўстання, урад вымушаны быў рэагаваць выданнем адпаведнага нарматыўна-прававога акта. Так, 11.03. 1863 года імператарам было зацверджана "Мнение Государственного Совета «О порядке производства дел о лицах женского пола, прикосновенных к преступлениям, подлежащим суду по полевым военно-уголовным законам»". Нарматыўны акт вызначаў наступны **прынцып падсуднасці**: **а)** жанчыны, якія абвінавачваліся ў здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных "Уставом военно-уголовным", сумесна з мужчынамі, траплялі пад юрысдыкцыю венных судоў. Аднак, **ваенна-судовыя камісіі** мусілі выносіць выракі на падставе "Уложения о наказаниях уголовных и исправительных", **б)** у іншых выпадках, жанчыны траплялі пад юрысдыкцыю **палат крымінальнага суда,** якія таксама дзейнічалі на падставе "Уложений", але прадуглежвалася працэдура пазачарговага разгляду спраў. Агульны вынік судова-следчай дзейнасці адлюстроўвае статыстыка. Так, **Часовы палявы аудытарыят пры камандуючым Віленскай ваеннай акругі** вынес прысуды адносна 1700 жанчын, абвінавачаных ва ўдзеле ў антыўрадавым руху 1861-1863 гг. Сярод іх 161 асоба паходзіць з тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў. У адносінах да іх былі прадугледжаны наступныя меры пакарання: **а) высылка ў Сібір –** 34 асобы**, б) арышт** тэрмінм ад 1 да 6 месяцаў – 15 асоб, **в) грашовы штраф** ад 10 да 200 рублёў – 56 асоб. На практыцы, канчатковая мера пакарання ў адносінах да асоб абвінавачаных у палітычных злачынствах знаходзілася ў кампетэнцыі віленскага-генерал губернатара. Як высноваў, судова-следчая сістэма створаная для барацьбы з паўстанцкім рухам не з'яўлялася органам незалежнай судовай галіной улады, а складала частку надзвычайнага адміністрацыйна-выканаўчага апарата.

Такім чынам, у перыяд 1861-1863 гг. урадам Расійскай імперыі быў прыняты шэраг нарматыўна-прававых актаў (з увагі на ўжо існуючыю сістэму заканадўства), якія вызначалі структуру і прынцып дзеяння судова-следчых органаў у адносінах да ўдзельнікаў антыўрадавага і паўстанцкага руху на тэрыторыі заходніх губерняў і ў Віцебскай і Магілёўскай губерняў, у прыватнасці.